УДК [030+323.1](476)

*К. В. Суша*

# Універсальная энцыклапедыя ў кантэксце нацыятворчых працэсаў

*Аналізуецца роля культуратворчай эліты грамадства ў працэсах утварэння нацыі. Разглядаецца нацыянальны праект як ідэалагічная аснова фарміравання нацыі. Даследуецца месца ўніверсальнай энцыклапедыі ў нацыянальным праекце. Асаблівая ўвага надаецца пытанню складвання беларускай нацыі і беларускаму вопыту выдання ўніверсальнай энцыклапедыі.*

Нацыятворчыя працэсы іграюць выключна важную ролю ў фарміраванні індывідуальнай і грамадскай свядомасці. Змястоўным напаўненнем гэтых працэсаў з'яўляюцца разнастайныя нацыянальныя праекты і ініцыятывы, якія кладуцца ў падмурак нацыі і складаюць яе апорныя канструкцыі. Адным з такіх праектаў выступае выданне ў той ці іншай краіне нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі. Паспрабуем разгледзець месца ўніверсальнай энцыклапедыі ў працэсах станаўлення нацыі як суб'екта культуры. Асаблівую ўвагу звернем на складванне беларускай нацыі і беларускі вопыт выдання ўніверсальнай энцыклапедыі.

Тэрмін «нацыя» (ад лац. «natio» – племя, народ) трывала ўвайшоў у навуковы і паўсядзённы ўжытак. Ён шырока выкарыстоўваецца ў гуманітарных навуках і ў той жа час выклікае вялікія спрэчкі. Многія дзесяцігоддзі ў айчыннай навуцы ён трактаваўся ў рамках гістарычнага матэрыялізму і стадыяльнай канцэпцыі развіцця этнасу ад племені праз народнасць да нацыі. У сённяшняе дыскурсіўнае поле айчыннай гуманітарыстыкі ўваходзяць розныя канцэпцыі заходнееўрапейскіх і амерыканскіх навукоўцаў, адбываецца пераасэнсаванне паняцця «нацыя», вылучаюцца новыя падыходы да яго.

У Старажытным Рыме тэрмін «natio» выкарыстоўваўся для абазначэння груп насельніцтва, якія не з'яўляліся грамадзянамі (г. зн. чужынцаў, іншаземцаў). У часы Высокага Сярэдневякоўя ў Еўропе словам «нацыя» пазначаліся студэнцкія карпарацыі, утвораныя па тэрытарыяльным прынцыпе (зямляцтвы) [16]. У XVI ст. яно ўжываецца ў афіцыйнай назве дзяржавы – Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі, а таксама ў загалоўку праграмнага твора М. Лютэра «Да хрысціянскага дваранства нямецкай нацыі» [7]. У XVII–XVIII стст. паняцце набыло саслоўна-палітычны сэнс – абазначала супольнасць людзей, якія валодаюць палітычнымі правамі, г. зн. дваранства.

Ідэя аб тым, што паняцце «нацыя» павінна быць распаўсюджана на народ як палітычны суб'ект, прагучала ў брашуры Э.-Ж. Сіеса [13].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначым, што ў выніку Вялікай французскай рэвалюцыі ўсе падданыя французскага караля сталі французскімі грамадзянамі, г. зн. часткай французскай нацыі. Адбыўся перанос суверэнітэту з караля на народ, а каралеўская ўлада стала разглядацца ў якасці вытворнай ад волі народа як палітычнага цэлага.

За некалькі стагоддзяў навуковай распрацоўкі тэрміна «нацыя» ў этналогіі склаліся два асноўныя падыходы да яго трактоўкі.

1. Нацыя разглядалася як асаблівая ступень развіцця этнасу (надавалася вялікае значэнне яе біялагічным асновам, адзінству крыві і агульным продкам). Прыхільнікамі такога падыходу былі І. Г. Гердэр, С. М. Шыракагораў, В. Мюльман, Ю. У. Брамлей, Л. М. Гумілёў і інш. Дарэчы, стадыяльная канцэпцыя развіцця этнасу ад племені праз народнасць да нацыі, распрацаваная ў рамках гістарычнага матэрыялізму, многія дзесяцігоддзі панавала ў айчыннай навуцы.

2. Разуменне нацыі як штучнага ўтварэння, мэтанакіравана сканструяванага культуратворчымі элітамі, – распрацоўвалася ў творах Э. Хобсбаума, В. А. Цішкова, Б. Андэрсана, Э. А. Гелнэра, П. Бурдзьё, Р. Брубейкера і інш. Гэты падыход прынята называць канструктывізмам.

У артыкуле мы будзем зыходзіць з пазіцый канструктывізму, не адмаўляючы неабходнасці гістарычнага выспявання пэўных сацыякультурных умоў для канструявання нацый. Гаворачы словамі амерыканскага філосафа Х. Кона, «нацыяналізм у сучасным разуменні гэтага тэрміна – не старэйшы за другую палову XVIII ст. <…> У канцы XVIII ст. нацыяналізм выявіўся амаль адначасова ў некалькіх еўрапейскіх краінах – прыйшоў яго час у эвалюцыі чалавецтва» [5].

Звернем увагу на сінергетычную мадэль самаарганізацыі адкрытых сістэм [8; 11] як асноўны метадалагічны падыход да разгляду працэсаў утварэння нацыі. Калі ўсталяваныя культурныя праграмы перастаюць забяспечваць эфектыўнае функцыянаванне сацыяльнай сістэмы, якая назапасіла мноства змен і перастала быць трывалай, у кропцы біфуркацыі пад уздзеяннем выпадковых фактараў адбываецца рэкамбінацыя яе элементаў і ўтвараецца новы парадак, новая сістэма. Такім чынам, з аднаго або некалькіх (і нават мноства) этнасаў у пэўных гістарычных абставінах утвараецца новая сацыяльна-эканамічная і культурна-палітычная супольнасць людзей – нацыя, якая мае сваю дзяржаўнасць або імкнецца да яе. Трэба падкрэсліць сацыяльны, а не біялагічны характар гэтага ўтварэння, бо нацыянальныя прыкметы і ідэнтыфікацыя не перадаюцца з пакалення ў пакаленне генетычным шляхам, а фарміруюцца ў працэсе сацыялізацыі нованароджанага ў пэўным культурным асяроддзі. «Этнас ёсць сацыяльная, а не біялагічная з'ява», – сцвярджае вядомы расійскі этнограф В. І. Казлоў [4, с. 16], і мы ў гэтым цалкам пагаджаемся з ім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выказаная прадстаўнікамі канструктывісцкай плыні ў этналогіі ідэя аб тым, што нацыя ўтвараецца на аснове нацыянальнага праекта дзякуючы намаганням інтэлектуальных эліт, падаецца нам цалкам слушнай. Нацыянальны праект – гэта пэўная ідэалогія, якая ствараецца культуратворчай элітай грамадства (навукоўцамі, палітыкамі, ідэолагамі, пісьменнікамі, мастакамі і да т. п.) і праяўляецца ў палітычных маніфестах, адукацыйных праграмах, літаратурных творах, навуковых працах, выяўленчым мастацтве і іншых формах.

У перыяд, які папярэднічае ўтварэнню нацыі (а таксама ў крызісныя моманты яе развіцця), у грамадстве распрацоўваюцца і адначасова існуюць некалькі такіх праектаў, што канкурыруюць паміж сабой. Выбар і замацаванне дамінуючай ідэалогіі, якая становіцца стрыжнем самаарганізацыі новай сацыяльнай сістэмы і кладзецца ў падмурак нацыі, адбываецца пад уздзеяннем мноства выпадковых фактараў і не можа быць прадказаны. Калі ж замацаванне пэўнага нацыянальнага праекта адбылося, ён пачынае актыўна развівацца, пранікае ва ўсе сферы жыцця, абрастае ўласнай міфалогіяй.

У той жа час нам цяжка пагадзіцца з выказваннямі В. А. Цішкова, вядомага расійскага прадстаўніка канструктывісцкай плыні, які ў некаторых сваіх працах сцвярджае, што паняцце этнічнай нацыі цалкам абстрактнае і не мае навуковай каштоўнасці [10]. Нам уяўляецца, што нацыя становіцца рэальным сацыяльным феноменам, калі мноства людзей убудоўваюць гэта паняцце ў сваю сістэму светапогляду, ідэнтыфікуюць сябе з яго дапамогай і яно, такім чынам, становіцца культурнай праграмай, якой людзі кіруюцца ў сваёй дзейнасці. Згодна са шматлікімі даследаваннямі, у індустрыяльным грамадстве нацыя з'яўляецца адной з асноўных форм ідэнтычнасці, у той час як у даіндустрыяльную эпоху вызначальнымі былі іншыя формы ідэнтычнасці, у тым ліку не этнічныя (саслоўе, рэлігія і г. д.). Да нядаўняга часу лічылася, што ў постіндустрыяльным грамадстве нацыянальная форма ідэнтычнасці паступова губляе сваё значэнне ва ўмовах нарастання глабалізацыі. Аднак падзеі апошняга дзесяцігоддзя, палітычныя змены ў многіх краінах свету парадаксальна дэманструюць рэнесанс нацыяналізму.

Такім чынам, стварэнне нацый разглядаецца ў межах сучасных канструктывісцкіх тэорый як вынік свядомай і мэтанакіраванай дзейнасці прадстаўнікоў элітарнай культуры, якія аказаліся больш здольнымі пашырыць свае погляды ў грамадстве.

Якое месца ў нацыятворчай дзейнасці культурных эліт належыць нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі? Нам падаецца, вельмі значнае. Аналіз гістарычных звестак дае мноства прыкладаў таго, што станаўленне нацый суправаджалася падрыхтоўкай і выданнем універсальных энцыклапедый на нацыянальных мовах (або няўдалымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спробамі ажыццявіць такое выданне, як гэта было ў БССР у 1930-я і 1950-я гг.).

Універсальная энцыклапедыя (ад грэч. «enkyklios paideia» – навучанне па ўсім коле ведаў, якімі павінен авалодаць паўнапраўны член антычнага грамадства) – гэта даведачная праца, як правіла, выкананая калектыўна, якая мае на мэце сістэмна адлюстраваць увесь назапашаны чалавецтвам запас ведаў. Падрыхтоўкай універсальных энцыклапедый сучаснага тыпу займаюцца адмысловыя інтэлектуальныя цэнтры, часта навуковыя ўстановы, якія прыцягваюць у якасці аўтараў высокаадукаваных людзей, вучоных, спецыялістаў у разнастайных прадметных галінах. Нярэдка гэты працэс кантралюецца дзяржаўнымі органамі ўлады. Такая энцыклапедыя разлічана на шырокую чытацкую аўдыторыю. Яна адлюстроўвае (літаральна фармулюе) уяўленні пра сусвет, уласцівыя для пэўнай культуры, і ў той жа час задае своеасаблівы эталон разумення навакольнага свету і ацэнкі падзей, якія адбываюцца ў ім. У гэтым сэнсе ўніверсальная энцыклапедыя з'яўляецца тэкстам культуры, яе праграмным кодам.

У ходзе вывучэння гісторыі ўніверсальных энцыклапедый паўстала наступная гіпотэза: на этапе станаўлення нацыі культуратворчыя эліты імкнуцца да стварэння нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі як важнага складніка нацыянальнага праекта. Гэта праца мае наступныя мэты: 1) усвядоміць сябе як нацыю і асэнсаваць сваё месца ў свеце, стварыць нацыянальную карціну свету; 2) зафіксаваць вынік гэтага асэнсавання, зрабіць яго эталонам для шырокіх колаў грамадства; 3) рэпрэзентаваць сябе на сусветнай арэне.

Паспрабуем на канкрэтных прыкладах разгледзець ролю ўніверсальных энцыклапедый у нацыятворчых працэсах розных краін свету.

Бадай, самай знакамітай універсальнай энцыклапедыяй сучаснага тыпу з'яўляецца «Энцыклапедыя, ці Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў» у 35 тамах, што выдавалася ў Францыі ў 1751–1780 гг. пад кіраўніцтвам Дэні Дзідро і Жана ля Рона д'Аламбера. Стваральнікі гэтай энцыклапедыі небеспадстаўна бачылі ў ёй дзейсны інструмент уздзеяння на грамадскую свядомасць. Д. Дзідро пісаў: «Насамрэч, мэта энцыклапедыі – сабраць веды, раскіданыя па свеце, прывесці іх у сістэму, зразумелую для людзей, якія жывуць сёння, і перадаць тым, хто прыйдзе пасля нас, з тым, каб праца папярэдніх стагоддзяў не стала марнай для стагоддзяў наступных, і каб нашы нашчадкі сталі больш адукаванымі, а разам з тым больш дабрадзейнымі і шчаслівымі, і каб мы не адышлі ў нябыт, не здолеўшы паслужыць будучым пакаленням» [19].

Матэрыялы, змешчаныя на старонках гэтай энцыклапедыі, падвяргалі крытыцы феадальны лад жыцця і панаванне рэлігійнага светапогляду, імкнуліся ўсталяваць прынцыпы рацыянальнага ўспрымання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свету і навуковага тлумачэння з'яў. Да напісання артыкулаў былі прыцягнуты выдатныя дзеячы эпохі Асветніцтва – Вальтэр, Ж.-Ж. Русо, Ш. Л. дэ Мантэск'ё, К. А. Гельвецый, П. А. Гольбах, Л. дэ Жакур, Ж. Л. Леклерк дэ Бюфон, Э. Б. дэ Кандзільяк, Г. Т. Рэйналь, А. Р. Ж. Цюрго і многія іншыя навукоўцы, пісьменнікі, інжынеры.

Энцыклапедыя атрымала вялікі грамадскі рэзананс. З аднаго боку, царкоўныя і свецкія ўлады абвінавачвалі яе ў тым, што яна наносіць шкоду грамадскай маралі, яе выданне неаднаразова прыпынялася, асобныя тамы забараняліся і канфіскоўваліся, аўтары падвяргаліся пераследу. З іншага боку, яна атрымала папулярнасць у шырокіх колах чытачоў і стала сусветна вядомай, карысталася вялікім попытам і нават мела фінансавы поспех. «Ніводная іншая энцыклапедыя не мела такой палітычнай значнасці, не займала такога прыкметнага месца ў жыцці грамадства і літаратурнай гісторыі свайго стагоддзя. Яна імкнулася не толькі даваць інфармацыю, але і фарміраваць меркаванне», – напісана пра французскую «Энцыклапедыю…» у «Брытанскай энцыклапедыі» 1911 г. [20]. Цікава адзначыць, што ў рускую мову само слова «энцыклапедыя» ўвайшло разам з тамамі працы Дзідро і д'Аламбера і першапачаткова ўжывалася выключна ў дачыненні да гэтага твора [14]. Энцыклапедыя стала выбітнай культурнай з'явай, квінтэсенцыяй ідэй Асветніцтва, інтэлектуальным падмуркам Вялікай французскай рэвалюцыі і працэсаў фарміравання французскай нацыі, якія адбываліся ў XVIII ст.

У 1731–1754 гг. дзякуючы намаганням Ё. Х. Зедлера ў Лейпцыгу выйшла ўніверсальная энцыклапедыя на нямецкай мове ў 68 тамах – яна называлася «Вялікі поўны ўніверсальны слоўнік усіх навук і мастацтваў». Гэта быў самы вялікі па аб'ёме энцыклапедычны праект XVIII ст. У 1778–1804 гг. у Франкфурце-на-Майне выйшла «Нямецкая энцыклапедыя, або Універсальны рэальны слоўнік усіх мастацтваў і навук» у 23 тамах. У 1768–1771 гг. англійскія асветнікі Эндру Бэл, Колін Макфаркар і Вільям Смелі падрыхтавалі і выпусцілі ў Эдынбургу «Слоўнік мастацтваў і навук», які даў пачатак «Брытаніцы» – самай аўтарытэтнай універсальнай энцыклапедыі на англійскай мове, што вытрымала 15 выданняў.

Трэба прызнаць, што ва ўсіх згаданых выпадках выданне ўніверсальных энцыклапедый невыпадкова супала з часам фарміравання адпаведных нацыянальных праектаў – французскага, нямецкага і брытанскага.

У XIX ст. універсальныя энцыклапедыі выйшлі ў Італіі, Аўстрыі, Польшчы, Даніі, Швецыі, Партугаліі, Нідэрландах, Чэхіі, Расіі, Аўстраліі, ЗША – у краінах, дзе ў гэты перыяд актыўна ішлі нацыятворчыя працэсы. У XX ст. да ліку нацый, якія падрыхтавалі і выдалі ўніверсальныя энцыклапедычныя працы, далучыліся Венгрыя, Румынія, Югаславія, Чэхаславакія, Грэцыя, Нарвегія, Бельгія, Швейцарыя, Канада, Ізраіль,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іспанія, Турцыя, Індыя, Японія, Кітай. Гэтыя выданні станавіліся з'явамі ў нацыянальным культурным жыцці, падымалі нацыянальную навуку на новы ўзровень развіцця, садзейнічалі фарміраванню прафесійнай лексікі ў нацыянальных мовах. У выпадках, калі першай універсальнай энцыклапедыяй у краіне станавіўся адаптаваны пераклад энцыклапедыі іншай нацыі, з цягам часу культуратворчая эліта вярталася да гэтага пытання і ініцыявала ажыццяўленне ўласнага энцыклапедычнага праекта (такім чынам у ХХ ст. былі падрыхтаваны «Італьянская энцыклапедыя навук, літаратуры і мастацтваў», вядомая як «Італьяна» або «Энцыклапедыя Трэкані», і «Універсальная ілюстраваная еўрапейска-амерыканская энцыклапедыя» («Эспаса»), якія сталі сапраўднымі помнікамі італьянскай і іспанскай навукі і культуры).

Беларускі нацыянальны праект, які прывёў да стварэння суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь, развіваўся ў складаных умовах.

У савецкім акадэмічным выданні «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (Мінск, 1985), якое з'яўляецца адным з першых грунтоўных абагульняючых даследаванняў развіцця беларускага этнасу, можна знайсці супярэчлівыя па сутнасці сцвярджэнні наконт храналагічных меж і ўмоў фарміравання беларускай нацыі. З аднаго боку, аўтары гэтай працы лічаць, што працэс паступовай кансалідацыі беларусаў у нацыю пачаўся ў канцы XVIII ст., а перыяд ад 1861 да 1917 г. характарызуюць як час развіцця беларускай нацыі ў эпоху капіталізму [18, с. 142]. З другога боку, даследчыкі прызнаюць, што этнічная кансалідацыя на аснове самасвядомасці ў гэты перыяд праяўлялася слаба. На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў другой палове XIX ст. бытавала мноства этнонімаў – «ліцвіны», «русіны», «рускія», «палешукі», «палясяне», «беларусы»; шляхта цесна звязвала сваю этнічную прыналежнасць з канфесійнай і ў большасці лічыла сябе палякамі [Там жа, с. 150].

Між тым беларускі гісторык В. Насевіч сцвярджае, што «галоўная этнавызначальная рыса – агульная самасвядомасць, альбо, іншымі словамі, нацыянальная ідэя» [9, с. 146], і ўслед за ім мы прапануем шукаць вытокі беларускай нацыі перш за ўсё ў сферы ідэй і нематэрыяльнай культуры.

Тэрміны «Белая Русь», «беларусы», «беларусцы» сустракаюцца ў літаратуры XIV–XVIII стст. [17, с. 11], аднак з этнічнай тэрыторыяй беларусаў (у сучасным сэнсе) гэтыя тэрміны супалі толькі ў другой палове XIX – пачатку ХХ ст. [9, с. 150].

Мы схільны да меркавання, што беларуская нацыя паўстала не раней за пачатак ХХ ст. у выніку рэалізацыі адпаведнага беларускага ідэалагічнага праекта. Сугучныя думкі можна знайсці ў тым ліку на старонках «Этнаграфіі беларусаў...», аўтары якой падкрэслівалі ролю са-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

цыяльных зрухаў таго часу: «Працэс уласна этнічнай кансалідацыі беларусаў <…> у перыяд капіталізму не завяршыўся. <…> Завяршэнне ўсіх гэтых працэсаў адбылося пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» [18, с. 166].

Падобна, што зараджэнне беларускага нацыянальнага праекта адбывалася ў другой палове XIX ст. В. Насевіч лічыць, што «ідэя самастойнасці беларускага народа была ўпершыню сфармуляваная, бадай што, народніцкай групай “Гоман”, якая дзейнічала сярод беларускіх студэнтаў у Пецярбургу ў 1880-я гг.» [9, с. 141]. Яна абвяшчала, што ў беларускага народа ёсць свае інтарэсы, іншыя, чым у рускіх ці палякаў, што Беларусь мае свае прыкметы, такія як этнаграфія, мова, менталітэт і культура насельніцтва. Аднак яшчэ раней падобныя думкі былі выказаны Кастусём Каліноўскім і яго паплечнікамі на старонках нелегальнай газеты «Мужыцкая праўда» [21]. Глеба для выспявання гэтай ідэі рыхтавалася на працягу канца XVIII–XIX ст. у розных сферах жыцця – палітычнай (дзейнасць студэнцкіх таварystваў, паўстанне 1863–1864 гг.), рэлігійнай (пратэсты супраць скасавання ўніяцкай царквы ў Беларусі), навуковай (выданне этнаграфічных прац П. Шпілеўскага, А. Кіркора, П. Шэйна, Е. Раманава, Я. Карскага і інш.), мастацкай (з’яўленне прафесійнай мастацкай літаратуры на беларускай мове – твораў Я. Баршчэўскага, Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, У. Сыракомлі, А. Вярыгі-Дарэўскага, П. Багрыма і інш.). Тэрмін «беларусы» паступова трапляў у масавую свядомасць. Пры правядзенні перапісу насельніцтва 1897 г. 74 % жыхароў Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі вызначылі сваю родную мову як беларускую [9, с. 141]. Адбывалася паступовая, запаволеная, з мноствам перашкод, аднак няспынная трансфармацыя Паўночна-Заходняга краю ў Беларусь.

Беларускаму нацыянальнаму праекту даводзілася жорстка канкурыраваць з іншымі ідэалагічнымі планамі, якія ўключалі насельніцтва беларускіх зямель у свае сферы ўплыву. У прыватнасці, з ідэямі аб несамастойнасці беларускага этнасу, аб гістарычнай і этнічнай еднасці беларусаў з рускім, або ўкраінскім, або польскім, або літоўскім народамі. Вядома, гэта было абумоўлена доўгім суіснаваннем з гэтымі народамі ў межах розных дзяржаўных утварэнняў – Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза. У свядомасці мясцовага насельніцтва адбывалася барацьба ідэй. Думка пра тое, што беларусы – гэта самастойны народ, які можа прэтэндаваць на ўласную дзяржаўнасць, выспявала вельмі марудна і прабівала сабе шлях з вялікімі цяжкасцямі.

Тым не менш да пачатку XX ст. дзякуючы намаганням культуратворчай інтэлігенцыі беларускі нацыянальны рух выразна аформіўся і атрымаў дастатковае развіццё. Ён быў накіраваны ў першую чаргу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«на стварэнне беларускай школы і друку. Ініцыятарам і ідэолагам яго выступіла інтэлігенцыя. Найбольш інтэнсіўна ў гэты час развіваліся літаратура і мастацтва, якія спрыялі ўзмацненню этнічнай свядомасці» [2, с. 420]. Беларуская культурная эліта прыкладала вялікія намаганні для стварэння з беларускага этнасу нацыі сучаснага тыпу.

Віхура ваенных і рэвалюцыйных падзей першай чвэрці ХХ ст. нада-ла больш-менш трывалай сістэме, якой з'яўлялася Расійская імперыя з уключанымі ў яе склад беларускімі землямі, стан хаосу. 1 студзеня 1919 г. у Смаленску адбылося абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (100-гадовы юбілей гэтай падзеі мы святкуем у гэтым годзе). Беларускі нацыянальны праект атрымаў уласную дзяржаўнасць, хай сабе і з абмежаванай самастойнасцю. Са стварэннем Беларускай ССР «пачалося нацыянальна-культурнае і нацыянальна-моўнае будаўніцтва, што вяло да ўмацавання менавіта беларускай самасвядомасці ў шырокіх народных масах. Фактар дзяржаўнасці адыграў вялізную ролю» [Там жа, с. 421]. Беларуская нацыянальная ідэя імкліва развівалася, афармля-лася, абрастала навуковымі канцэпцыямі, якія павінны былі вызначыць месца беларусаў у сістэме гістарычных і геаграфічных каардынат.

Ідэя выдання нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі не за-сталася па-за ўвагай інтэлектуальнай эліты маладой беларускай нацыі. У сакавіку 1932 г. аб'яднаны пленум Цэнтральнага камітэта (ЦК) і Цэнтральнай кантрольнай камісіі Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) прыняў пастанову «Аб культурным будаўніцтве ў БССР», дзе адзначалася неабходнасць разгортвання рабо-ты па выданні энцыклапедый. У 1934 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло па-станову аб выданні 10-томнай універсальнай энцыклапедыі пад назвай «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (БелСЭ). Пры Акадэміі навук БССР была створана Галоўная рэдакцыя БелСЭ, якую ўзначаліў доктар гістарычных навук, прэзідэнт Акадэміі навук БССР П. В. Горын (1900–1938). У 1935 г. былі выдадзены тэматычныя слоўнікі і падрыхтаваны да друку 1-ы том энцыклапедыі.

Аднак у 1937–1938 гг. па прычыне масавых рэпрэсій супраць інтэлігенцыі работа па выданні БелСЭ была спынена, а Галоўная рэдак-цыя распушчана. Кіраўніцтва БССР, якое прыняло рашэнне аб выданні энцыклапедыі, а таксама многія аўтары і рэдактары энцыклапедычных артыкулаў былі абвешчаны ворагамі народа і падпалі пад рэпрэсіі. Ні рукапісаў, ні карэктур падрыхтаваных тамоў не захавалася (больш па-драбязна з гісторыяй нявыдадзеных беларускіх энцыклапедый 1920–1940-х гг. можна пазнаёміцца ў публікацыі М. М. Ліс) [6]. Загінулі амаль усе арганізатары беларускага палітычнага, навуковага і культурнага жыцця 1920-х гг. – эліта, носьбіты нацыянальнай ідэі.

Наступная спроба ажыццявіць выданне беларускай універсальнай энцыклапедыі адносіцца да 1957–1958 гг. Па даручэнні першага сакра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тара ЦК КП(б)Б К. Т. Мазурава, які ў першыя гады свайго кіравання спрабаваў праводзіць палітыку беларусізацыі і ўсебакова падтрымліваў развіццё беларускай нацыянальнай культуры, пытанне аб выданні ўніверсальнай энцыклапедыі абмяркоўвалася ў аддзеле навукі і вышэйшых навучальных устаноў ЦК КП(б)Б і на пасяджэнні Прэзідыума Акадэміі навук БССР. У выніку быў распрацаваны праект выдання БелСЭ, якую планавалася выпусціць у 1958–1965 гг. на беларускай мове ў аб'ёме ад 8 да 10 тамоў тыражом 15 тыс. асобнікаў [1, с. 16–17]. Аднак выданне БелСЭ ў 1958 г. так і не пачалося. Сёння цяжка дакладна сказаць, што перашкодзіла гэтаму. Хутчэй за ўсё гэты праект быў адхілены кіраўніцтвам СССР з прычыны неадпаведнасці прынцыпам нацыянальнай палітыкі савецкай дзяржавы, неаднаразова агучаным першым сакратаром ЦК КПСС М. С. Хрушчовым (у тым ліку ў час яго візіту ў Мінск у снежні 1959 г.) [15]. Стрыжнем гэтай палітыкі абвяшчалася ўсеагульная русіфікацыя дзеля мэт найхутчэйшага стварэння агульнай гістарычнай і культурнай супольнасці – савецкага народа, носьбіта камуністычнай ідэалогіі. Нацыянальная ўніверсальная энцыклапедыя на беларускай мове дрэнна ўпісвалася ў яе рамкі.

І ўсё ж пытанне аб энцыклапедыі было зноў пастаўлена на парадак дня ў 1966 г. (пасля адстаўкі М. С. Хрушчова) пры непасрэдным удзеле першага сакратара ЦК КП(б)Б П. М. Машэрава, які замяніў на пасту К. Т. Мазурава ў сакавіку 1965 г. і праявіў сябе як амбіцыйны, актыўны і таленавіты адміністратар. П. М. Машэраў прыклаў шмат намаганняў для рэалізацыі ідэі выдання беларускай універсальнай энцыклапедыі. Пастанова ЦК КП(б)Б і Савета Міністраў БССР «Аб выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі» ад 30 снежня 1966 г. зацвердзіла рашэнне падрыхтаваць і выдаць БелСЭ на працягу 1967–1974 гг. у 8 тамах, па 75 друкаваных аркушаў кожны том, тыражом 30 тыс. асобнікаў (пазней гэта рашэнне было скарэкціравана – энцыклапедыя выйшла ў 12 тамах па 50 друкаваных аркушаў кожны) [1, с. 24]. Для ажыццяўлення гэтай работы 1 студзеня 1967 г. у структуры Акадэміі навук БССР была створана Галоўная рэдакцыя БелСЭ на правах навукова-даследчай установы. Галоўным рэдактарам прызначаны народны паэт БССР, акадэмік Акадэміі навук БССР П. У. Броўка (1905–1980).

У 1975 г. выданне 12-томнай БелСЭ, першай у гісторыі беларускага народа ўніверсальнай энцыклапедыі на беларускай мове, было паспяхова завершана. Да ўдзелу ў напісанні артыкулаў былі прыцягнуты найлепшыя сілы беларускай навукі, аўтарытэтныя спецыялісты па ўсіх галінах ведаў. Сярод цяжкасцей, з якімі сутыкнулася рэдакцыя пры падрыхтоўцы энцыклапедыі, – адсутнасць даследаванняў па многіх навуковых праблемах і нават цэлых раздзелах па гісторыі, літаратуры, мастацтве, мовазнаўстве, геаграфіі, эканоміцы, гісторыі кніжнай справы ў Беларусі, нераспрацаванасць навуковай беларускай тэрміналогіі, не-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастатковая стандартызацыя тэрмінаў, а таксама закрытасць адпаведных распрацовак 1920–1930-х гг. рэпрэсіраваных беларускіх вучоных. Многае давялося рабіць фактычна «з нуля». Рэдакцыя працавала ў цесным кантакце з беларускімі і замежнымі навукоўцамі, сумяшчала выдавецкую дзейнасць з навукова-даследчай.

Вядома, неабходнасць адпавядаць сацыялістычнай ідэалогіі, што панавала на той час у дзяржаве, накладвала істотныя абмежаванні, прымушала абыходзіць увагай забароненыя тэмы і персаналіі, уплывала на ацэнку адлюстраваных на старонках энцыклапедыі сацыяльных з'яў і падзей.

БелСЭ карысталася вялікім попытам і была высока ацэнена ў грамадстве. Яна садзейнічала ўздыму грамадскай цікавасці да культуры і гісторыі краіны, росту патрыятызму, гонару за гістарычныя дасягненні продкаў і развіццю нацыянальнай самасвядомасці.

Пра тое, наколькі важным уяўлялася выданне ўніверсальнай энцыклапедыі для культуратворчай эліты беларускай нацыі, сведчаць наступныя факты. Па ўспамінах аўтара бадай найбольш паспяховай серыі беларускіх буквароў Анатоля Клышкі, класік беларускай літаратуры Максім Танк у 1968 г. выказаўся, «што дзяржаўным народам прызнаецца народ, які мае свае герб, гімн, сцяг, буквар і энцыклапедыю» [3]. Другі класік беларускай літаратуры Іван Мележ у выступленні на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў у 1966 г. назваў БелСЭ «самым вялікім выданнем за паўстагоддзя беларускай культуры» [1, с. 27]. Такім чынам, універсальная энцыклапедыя ўспрымалася як неабходная, неад'емная частка беларускага нацыянальнага праекта.

Варта падкрэсліць, што БелСЭ выйшла на беларускай мове ў гады актыўнай русіфікацыі. Гэты факт быў спецыяльна адзначаны ў 1987 г. у дакладзе першага сакратара ЦК КП(б)Б Я. Я. Сакалова як дасягненне нацыянальнай палітыкі [12].

У 1990 г. пачаўся новы этап у нацыятворчым працэсе беларускага народа – 27 ліпеня 1990 г. прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, 19 верасня 1991 г. краіна атрымала назву Рэспубліка Беларусь, а 15 сакавіка 1994 г. прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. У гэтым кантэксце актуальнай задачай стала сістэматызацыя нацыянальнага светапогляду ва ўмовах незалежнай дзяржавы. У 1996–2004 гг. пад назвай «Беларуская энцыклапедыя» выйшла з друку нацыянальная ўніверсальная энцыклапедыя суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Яна была выдадзена на беларускай мове ў 18 тамах (19 кнігах). Яе падрыхтоўка адпавядала тым значным сацыяльна-палітычным і культурным зменам у жыцці беларускай нацыі, якія адбыліся пасля распаду Савецкага Саюза.

Па меры нарастання глабалізацыі, развіцця інфармацыйнай сеткі Інтэрнэт і пераходу краін свету да постіндустрыяльнага грамад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства вялікую папулярнасць, у тым ліку сярод беларусаў, набыла новая форма ўніверсальнай энцыклапедыі – агульнадаступная шматмоўная ўніверсальная інтэрнэт-энцыклапедыя са свабодным кантэнтам «Вікіпедыя». Мы бачым у гэтым паступовае замацоўванне ў грамадскай свядомасці новай інфармацыйнай і культурнай парадыгмы і новага падыходу да ўніверсальнай энцыклапедыі: як форма падачы інфармацыі яна працягвае карыстацца надзвычай вялікай папулярнасцю (нават больш таго – колькасць зваротаў да «Вікіпедыі» значна перавышае тую запатрабаванасць, якую калі-небудзь мела тая ці іншая друкаваная энцыклапедыя), аднак цяпер яе ствараюць і рэдагуюць не абраныя ці прызначаныя эксперты, не эліта, а кожны, хто жадае гэтага. Запатрабаванасць адмыслова падрыхтаваных навукоўцамі нацыянальных універсальных энцыклапедый відавочна памяншаецца.

Такім чынам, універсальная энцыклапедыя ўяўляецца важным складнікам нацыянальнага праекта. Культуратворчыя эліты грамадства, якія распрацоўваюць і развіваюць нацыянальную ідэалогію, накіроўваюць значныя намаганні на стварэнне нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі на этапе фарміравання нацыі, а таксама на рэвізію, перагляд, падрыхтоўку новых рэдакцый энцыклапедыі ў перыяды значных сацыяльна-палітычных і культурных змен у жыцці нацыі. На пераломных стадыях нацыятворчага працэсу паўстае неабходнасць у рэфлексіі, асэнсаванні, сістэматызацыі і эталонным выражэнні ўяўленняў пра свет і месца нацыі ў ім. Універсальная энцыклапедыя з'яўляецца надзвычай прыдатнай формай для фіксавання і распаўсюджвання вынікаў гэтай дзейнасці культуратворчых эліт. З выхадам нацыі на стабільны этап развіцця цікавасць да нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі значна зніжаецца.

*1.* Імя Петруся Броўкі Беларуская Энцыклапедыя / уклад. Л. В. Календа. – Мінск : БелЭн, 2005. – 263 с.

*2. Каспяровіч, Г. І.* Этнічная самасвядомасць беларусаў / Г. І. Каспяровіч // Беларусы / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск, 2001. – С. 419–425.

*3. Клышка, А.* Я ўзяўся за напісанне беларускага буквара і… перамог / А. Клышка ; гутарыў С. Чыгрын // Czasopis. – 2012. – № 11. – С. 19.

*4. Козлов, В. И.* Этнос. Нация. Национализм : сущность и проблематика / В. И. Козлов. – М. : Старый сад, 1999. – 343 с.

*5. Кон, Х.* Идея национализма [Электронный ресурс] / Х. Кон // Открытый университет. – Режим доступа: https://openuni.io/course/9-course-7-2/lesson/5/material/809. – Дата доступа: 19.04.2019.

*6. Ліс, М. М.* Беларускія энцыклапедычныя выданні 1920–1940-х гг.: нявыдадзеныя энцыклапедыі / М. М. Ліс // Матэрыялы XV Міжнар. кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 4–5 крас. 2019 г. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2019. – С. 274–278.

*7. Лютер, М.* К христианскому дворянству немецкой нации об улучшении христианского состояния / М. Лютер ; пер. В. С. Рожицына. – Харьков : Тип. М. Зильберберг и с-вья, 1912. – 72 с.

*8. Можейко, М. А.* Становление концепции нелинейных динамик в современной культуре : сравн. анализ синергет. и постмодернист. исслед. стратегий : автореф.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дис. ... д-ра филос. наук : 09.00.11 / М. А. Можейко ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2000. – 42 с.

*9. Насевіч, В. Л.* Беларусы : станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя / В. Л. Насевіч. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 526 с.

*10.* Научные труды Валерия Тишкова [Электронный ресурс] // Личный сайт Валерия Тишкова. – Режим доступа: http://www.valerytishkov.ru/cntnt/publikacii3.html. – Дата доступа: 15.01.2019.

*11. Пригожин, И.* Порядок из хаоса : Новый диалог человека с природой / И. Пригожин, И. Стенгерс ; пер. с англ. Ю. А. Данилова. – М. : Прогресс, 1986. – 432 с.

*12. Сакалоў, Я. Я.* Аб задачах партыйных арганізацый Рэспублікі па паглыбленню Перабудовы, паляпшэнню работы з кадрамі ў святле патрабаванняў Студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС : даклад Я. Я. Сакалова / Я. Я. Сакалоў // Звязда. – 1987. – 27 сак. (№ 52). – С. 1–3.

*13. Сийес, Э. Ж.* Что такое третье сословие? / Э. Ж. Сийес ; введ. В. Богучарского. – СПб. : Голос, 1906. – 64 с.

*14. Симон, К. Р.* Термины «энциклопедия» и «свободные искусства» в их историческом развитии / К. Р. Симон // Избранное / К. Р. Симон. – М., 1984. – С. 45–67.

*15. Снапкоўскі, У.* Эліта і мова / У. Снапкоўскі // Аняменне: з хронікі знішчэння беларус. мовы : зб. арт. / Т-ва беларус. мовы імя Ф. Скарыны. – Вільня, 2000. – С. 33–40.

*16. Тесля, А.* Понятие нации [Электронный ресурс] / А. Тесля // Постнаука : сайт о совр. фундам. науке и ученых, которые ее создают. – Режим доступа: https://postnauka.ru/video/86802. – Дата доступа: 15.01.2019.

*17. Чаквін, І. У.* Паходжанне беларускага народа / І. У. Чаквін // Беларусы : сучасныя этнакультурныя працэсы / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск, 2009. – С. 11–27.

*18.* Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 215 с.

*19. Diderot, D.* Encyclopédie [Electronic resource] / D. Diderot // Encyclopédie, ou Dictionnaire raisonné des sciences, des arts et des métiers : en 17 vol. / mis en ordre et publié par Diderot et d'Alembert. – 1re éd. – Paris, 1751. – T. 5. – Mode of access: https://fr.wikisource.org/wiki/L%E2%80%99Encyclop%C3%A9die/1re_%C3%A9dition/ENCYCLOP%C3%89DIE]. – Date of access: 16.02.2019.

*20.* Encyclopédie [Electronic resource] // Wikipedia : the free encyclopedia. – Mode of access: https://en.wikipedia.org/wiki/Encyclop%C3%A9die. – Date of access: 16.02.2019.

*21.* Mužyckaja praŭda : [газета-лістоўка] / Яська Гаспадар з-пад Вільні. – 1862–1863. – № 1–7.

*K. Susha*

**Universal encyclopedia in the context of the processes of nation creation**

*The role of the cultural elite of a society in the processes of a nation creation is analyzed. The national project as an ideological basis for the formation of the nation is considered. The place of the universal encyclopedia in the national project is investigated. The issue of the Belarusian nation's formation and the Belarusian experience of the universal encyclopedia's publishing are emphasized.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 16.07.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ